# ЭЛЕМЕНТЫ ЭЎРЫСТЫКІ Ў ПРАКТЫЦЫ НАВУЧАННЯ САЧЫНЕННЮ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ «ТВОРЧАСЦЬ»

***І. Д. Воюш***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*vojush@rambler.ru*

Эўрыстычныя метады навучання як адны з самых старажытных паводле паходжання і адны з самых сучасных паводле напаўнення забяспечваюць рашэнне наступных адукацыйных задач пры падрыхтоўцы абітурыентаў факультэта журналістыкі да ўступных іспытаў па дысцыпліне «Творчасць»: боязь слова, адсутнасць вопыту самастойнага крэатавання, прыхільнасць да стандартызаванага рашэння задач, апора на аўтарытэты, шаблоннае мысленне, перанос вопыту школьных сачыненняў па літаратуры на вучэбны публіцыстычны тэкст. Апісаны вопыт выкарыстання метадаў асацыяцый, эмпатыі і дэкампазіцыі.

***Ключавыя словы:*** эўрыстычныя метады; методыка навучання сачыненню; абітурыенты ВНУ.

# ELEMENTS OF HEURISTICS IN TEACHING ESSAY ON «CREATIVITY» DISCIPLINE

***I. D. Voyush***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: I. D. Voyush (vojush@rambler.ru)*

Heuristic teaching methods as one of the most ancient in origin and one of the most advanced in filling, makE it possible to solve the following educational problems when preparing applicants to the journalism faculty for entrance exams in the «Creativity» discipline: fear of the word, lack of experience of independent creative work, addiction to standards for task solving, reliance on authorities, template thinking, transferring the experience of school works in literature to educational journalistic text. The experience of using the methods of association, empathy and decomposition is described.

***Keywords:*** heuristic methods; methodology of teaching composition; university applicants.

Прадукты крэатыўнай індустрыі – адны з самых запатрабаваных на рынку, залежным ад інфармацыйных плыняў ідэалогіі, рэкламы, брэн-

дынгу, сувязяў з грамадскасцю. Адпаведна, запатрабаваныя спецыялісты ў галіне творчай апрацоўкі інфармацыі, у тым ліку журналісты.

Сярод метадаў навучання творчасці эўрыстычныя – паводле прынцыпаў ажыццяўлення – адны з самых старажытных, але з канца мінулага стагоддзя яны – паводле варыятыўнасці і напаўнення, шырыні ахопу задач у розных галінах навук – сталі сучаснымі. Да сёння эўрыстыка застаецца актуальнай для ўстаноў, якія забяспечваюць падрыхтоўку выпускнікоў творчых прафесій.

Шлях да ўсведамлення сябе асобай крэатыўнай ляжыць менавіта праз асэнсаванне сябе такой. Для маладога журналіста падобны пераход у шэрагі творцаў адбываецца падчас першых спроб пяра, у абітурыенцкія гады. Менавіта на гэтым этапе мэтазгодна ўзброіць адоранаую асобу метадамі пошуку крэатыўных рашэнняў – гэта значыць, навучыць думаць эўрыстычна.

На працягу болей як дзесяці гадоў фарміраванню творчых здольнасцяў будучых студэнтаў факультэта журналістыкі спрыяюць падрыхтоўчыя курсы па дысцыпліне «Творчасць». Пры навучанні творчаму сачыненню публіцыстычнага характару выкладчыкі традыцыйна сутыкаюцца з некаторымі праблемамі: адсутнасць у слухачоў вопыту самастойнага крэатавання, боязь слова, прыхільнасць да рашэння стандартызаваных задач, апора на аўтарытэты, шаблоннае мысленне, перанос вопыту школьных сачыненняў па літаратуры на навучальны публіцыстычны тэкст.

Добра сябе зарэкамендавалі пры падрыхтоўцы да ўступнага сачынення эўрыстычныя метады мазгавога штурму і сяміразовага пошуку (адказу на 7 пытанняў: што? хто? дзе? калі? чым? навошта? як?). Тым не менш нявырашанымі застаюцца задачы навучання абітурыентаў: 1) унутранай логіцы пабудовы тэксту, 2) яго адпаведнасці чытацкаму запыту і 3) дакладнаму структураванню.

Найлепшымі ў сэнсе вырашэння пастаўленых задач – па выніках назіранняў за апошнія пяць гадоў – апынуліся метады асацыяцый, эмпатыі і дэкампазіцыі.

*Метад славесных асацыяцый* вельмі эфектыўны у асэнсаванні зададзенай тэмы сачынення і яе распрацоўцы. Ён выкарыстоўваецца паэтапна. Напачатку тэма запісваеца на дошцы, у аўдыторыі аб’яўляецца ціхая паўза на некалькі хвілін, каб кожны змог ўсвядоміць тэму і сваё стаўленне да яе.

Наступны крок – прапанова знайсці ў тэме ключавое слова і даць тлумачэнне, чаму менавіта гэта слова абрана. Звычайна меркаванні

абітурыентаў наконт галоўнага слова разыходзяцца, што потым дае магчымасць прайсці рознымі ланцужкамі асацыяцый некалькі разоў, адштурхоўваючыся ад розных ключавых слоў.

Пасля слухачы адвольна сумесна падбіраюць да абранага імі ключавога слова славесныя асацыяцыі паводле сумежнасці, кантрасту і падабенства. Гэта могуць быць не толькі самастойныя часціны мовы, але і ўстойлівыя выразы, лічбавыя даныя, мікрагісторыі, зрокавыя вобразы, эмоцыі, гукі, пахі, адчуванні. Асацыяцыі коратка запісваюцца пад словам-стымулам у калонку.

Калі работа завершана, распачынаецца строгі адбор найбольш яркіх і непасрэдна звязаных з тэмай асацыяцый. Звычайна метадам выключэння іх пакідаюць ад трох да шасці.

Самы складаны момант – гэта знаходжанне сэнсавых сувязяў паміж абранымі асацыяцыямі (на папярэдніх занятках выконваюцца практыкаванні на звязванне ў адно 2-3 далёкіх па сферы выкарыстання слоў, напрыклад, «вёрстка – вітаміны – Аўстралія»). Пасля ўстанаўлення лагічнай сувязі паміж абранымі кампанентамі вымалёўваецца план асноўнай часткі сачынення, запісваецца ў табліцу, дзе насупраць кожнага пункта ўносяцца аргументы – лічбы, назіранні, факты, гісторыі, вытрымкі са СМІ, навіны, цытаты.

Да асноўнай часткі рыхтуюцца падводка і заключэнне. Зразумела, што нявыкарыстаныя асацыятыўныя ланцужкі могуць лексічна разнастаіць выніковы тэкст пры дапрацоўцы.

*Метад эмпатыі* ў чыстым выглядзе складаны па выкананні ва ўніверсітэцкай аўдыторыі, але яго элементы цалкам могуць задаволіць патрэбы навучальнага працэсу. Яго каштоўнасць у тым, што ён пераклікаецца з метадам «журналіст мяняе прафесію» і сам па сабе ўтрымлівае прафарыентацыйны кампанент.

Пачынаецца знаёмства з метадам праз гульнявы элемент – расказванне агульнавядомай гісторыі, напрыклад, пра Чырвоную Шапачку, вуснамі галоўнай гераіні, другасных персанажаў.

Затым выконваецца практыкаванне па стылістыцы, калі абітурыенты становяцца на месца стваральніка тэксту і па групах рыхтуюць невялікія матэрыялы розных стыляў паводле любой сюжэтнай песні, верша. Важна адразу задаць канкрэтны від СМІ, для якога будзе падрыхтаваны тэкст, і канкрэтны стыль маўлення, каб пазней прааналізаваць адпаведнасць чытацкага запыту, стылю і журналісцкай ідэі.

*Дэкампазіцыя* як метад стварэння навучальный праблемнай сітуацыі дазваляе з карысцю правесці заняткі па структуры сачынення. Просты

падзел гатовай працы на кампазіцыйныя часткі не дае такога плёну, як узнаўленне чужога дэкампанаванага тэксту, выпраўленне памылак у парадку аргументацыі. Па-іншаму паглядзець на важнасць парадку думак дазваляе таксама падбор уступу-заключэння да дадзенай асноўнай часткі, працяг тэксту паводле гатовага ліда, тэзіраванне-аргументацыя асноўнай часткі пад гатовае заключэнне.

У якасці выніковага практыкавання мэтазгодна прапанаваць 4-5 разнародных фактаў-урыўкаў з падрабязнасцямі, з якіх неабходна самастойна скампанаваць тэкст, вылучыўшы галоўную думку, падабраўшы ўступ і заключэнне і даўшы загаловак. Для абітурыентаў-удзельнікаў алімпіяд заданне можна ўскладніць, уключыўшы ў карткі з фактамі лішнія, далёкія ад агульнай тэмы ўрыўкі.

Адным словам, элементы эўрыстыкі на падрыхтоўчых курсах дапамагаюць слухачам ажыццявіць пераход ад школьнай узнаўленчай маўленчай практыкі па ўзоры да творчага працэсу складання новага тэксту – лагічнага, адраснага, структураванага, а таксама да адкрыцця ўласных крэатыўных здольнасцяў.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. Лапыгин Ю. Н. Активизирующие и эвристические методы выработки вариантов решений // Управленческие решения // Вики Чтение: маркетинг [Электронный ресурс]. URL: https://marketing.wikireading.ru/16739 (дата обращения: 23.08.2019).

## ОСОБЕННОСТИ ОСВЕЩЕНИЯ ОБЩЕСТВЕННО-ПОЛИТИЧЕСКИХ ПРОЦЕССОВ В СОЦИАЛЬНЫХ СЕТЯХ В КАЗАХСТАНЕ

***М. Ю. Галкина[1)] А. Ю. Образцова[2)]***

*[1)]Московский государственный университет им. М. В. Ломоносова, ул. Моховая, 9/1, 125009, г. Москва, Россия, marina.galkina@mail.ru,*

*[2)]Московский государственный университет им. М. В. Ломоносова, ул. Моховая, 9/1, 125009, г. Москва, Россия, obraztsova.anastasia@gmail.com*

Проблемы организации политического процесса в новых медиа стран постсоветского пространства в научной литературе изучены слабо: если российский опыт еще время от времени становится предметом исследова-